девушек (13,3—18,6 %). Очевидно, это связано с тем, что для девушек профессиональный выбор чаще является случайным.

Как свидетельство верного профессионального определения можно расценивать стремление студентов выбрать те же специальность и учебное заведение, если бы пришлось выбирать снова. Таких респондентов в исследовании — 37,8 %. Доля молодых людей, ошибочно выбравших специальность и место учебы, даже немного выше — 41,7 %. Юноши в полтора раза чаще девушек убеждены в правильности профессионального самоопределения (44,7 % против 31,9 %). Среди студентов, решивших после окончания учебы поступать в другое учебное заведение и получать другую специальность, — 20,4 % юношей и 27,0 % девушек.

Важным фактором профессиональной социализации является работа по приобретаемой специальности. Респондентов, совмещавших учебу с работой по своей (смежной) специальности в гендерных группах примерно поровну (1/4).

По результатам проведенного исследования гендерные особенности профессиональной социализации молодежи можно характеризовать следующим образом.

Анализ социальных процессов в современном обществе показывает, что место и роль женщин в социальных институтах радикально меняется в сторону расширения сфер их самореализации. В современных экономических условиях увеличился приток женщин в типично мужские сферы профессиональной деятельности. Эта тенденция нашла свое отражение и в Беларуси.

Проведенное исследование показало наличие различных профессиональных требований, предъявляемых к юношам и девушкам на этапе обучения в вузе. Для девушек были характерны наиболее типичные женские модели поведения: меньшая активность, уверенность, агрессивность, напористость, склонность к эмпатии, социабельность. Так как экспертные оценки носили субъективный характер и частично отражали установки самих экспертов, выявленные личностные особенности могут быть рассмотрены не только как профессионально-важные качества, но и как наиболее социально желательные стереотипы поведенческих реакций. Таким образом, полученные результаты подтвердили гипотезу о влиянии гендерных стереотипов на оценку профессиональной эффективности.

Мы выяснили, что юноши выше актуализируют материальный аспект труда (хотя в ряду жизненных ценностей придают материальной обеспеченности меньшее значение, чем девушки), менее ориентированы на содержательные моменты трудовой деятельности, чаще выбирают профессию по призванию, больше удовлетворены процессом профессиональной подготовки, реже намереваются переучиваться другой специальности. Девушки меньше, чем юноши, ориентированы на материальный фактор в труде,



однако более заинтересованы в содержательных аспектах работы, при этом чаще юношей обучаются профессии, выбранной случайно, соответственно, менее удовлетворены процессом обучения и чаще планируют сменить специальность. Данные характеристики не являются исчерпывающими и в определенном смысле противоречивы, что отражает сложность и неоднозначность процесса профессиональной социализации. Один из основных выводов исследования состоит в том, что для значительной части молодых людей, заканчивающих обучение специальности, профессиональное самоопределение не стало реальностью, процесс поиска своего места в пространстве трудовой деятельности не завершен. Обозначаются две основные линии планирования студентами своих действий после окончания учебного заведения: одна — характеризуется установкой на самодостаточность, активность, достижение цели, профессиональную реализацию; другая — выражается в стремлении выждать, отложить выход на рынок труда, отсрочить реальную трудовую деятельность.



**Дзюбкова Т. П.,**
кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт,
дацэнт кафедры экалогіі чалавека
гуманітарнага факультэта Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта

## ГЕНДАРНЫЯ АСПЕКТЫ РЭПРАДУКТЫЎНЫХ ПАВОДЗІН СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія адбываліся на тэрыторыі краін постсавецкай прасторы ад пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, міграцыя насельніцтва, значнае пашырэнне замежных кантактаў, прапаганда насілля ў розных інфармацыйных сродках, у тым ліку на тэлебачанні і ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, суправаджаліся трансфармацыяй асобасных і грамадскіх каштоўнасцей, змяненнем духоўных прыярытэтаў, лібералізацыяй сексуальнай маралі. Апошняя пацягнула за сабой істотныя змены ў рэпрадуктыўных паводзінах і ўстаноўках асоб фертыльнага ўзросту, асабліва моладзі — найбольш актыўнай, дынамічнай і прагрэсіўна арыентаванай часткі грамадства [1; 2]. У сувязі са спадам нараджальнасці, няўхільным ростам паказчыкаў агульнай смяротнасці і, як следства, значным скарачэннем колькасці насельніцтва краіны ў апошнія дзесяцігоддзі набывае актуальнасць праблема захавання генафонду нацыі і рэпрадуктыўнага патэнцыялу айчыннай моладзі для выйсця з дэмаграфічнага крызісу.

Мэта працы — выявіць асаблівасці рэпрадуктыўных паводзін студэнтаў класічнага ўніверсітэта ў залежнасці ад іх гендарнай прыналежнасці.

Матэрыялы і метады. Запланаваны аб'ём выбаркі склаў 1170 чалавек. Пры яе фарміраванні выкарастаны выпадковы беспаўторны адбор рэспандэнтаў. У сувязі з адсутнасцю ў частцы выпадкаў водгуку (адмаўленне ад удзелу ў даследаванні, адсутнасць на момант апытання) фактычны аб'ём выбаркі склаў 1102 рэспандэнты. Асноўныя дэтэрмінанты рэпрадуктыўных паводзін даследаваны ў дзвюх кагортах студэнтаў класічнага ўніверсітэта, якія навучаліся на розных факультэтах. У склад першай з іх увайшлі 469 рэспандэнтаў: дзяўчат было 383 (81,66 %), юнакоў — 86 (18,34 %). Сярэдні ўзрост — 20,20 ± 0,89 гадоў. Доля рэспандэнтаў абодвух полаў адпавядала гендарным суадносінам на факультэтах. Інструментам даследавання была папярэдне апрабіраваная ананімная анкета ў двух варыянтах. Абавязковай умовай апытання была інфармаваная добраахвотная згода ўдзельнікаў даследавання. Усе студэнты былі папярэдне азнаёмлены з мэтай апытання і правіламі запаўнення анкеты. Кожнае пытанне анкеты патрабавала толькі аднаго адказу. Першы варыянт анкеты характарызаваў некаторыя дэтэрмінанты дашлюбных сексуальных паводзін і ўстановак студэнцкай моладзі. Другая кагорта была прадстаўлена 526 юнакамі і дзяўчатамі. Сярэдні ўзрост рэспандэнтаў склаў 20,24 ± 0,67 гадоў. Дзяўчат было 407 (77,38 %), юнакоў — 119 (22,62 %). Прызначаны для іх варыянт анкеты ўтрымліваў блок пытанняў, якія адлюстроўвалі кольКасны бок рэпрадуктыўнай установкі і матывацыі нараджэння дзяцей. Анкеты, якія не адпавядалі правілам запаўнення, былі выключаны з выбарачнай сукупнасці (выбракоўка — 9,7 %). Агульная колькасць анкет, прыдатных да статыстычнай апрацоўкі і аналізу, склала 995 адзінак. Статыстычная апрацоўка вынікаў даследавання ажыццяўлялася з выкарыстаннем стандартнага пакета прыкладных камп'ютарных праграм Statistica (версія 6.0). Аналіз якасных прыкмет ажыццяўлялі шляхам разліку выбарачнай долі і яе памылкі. Розніцу паміж групамі лічылі статыстычна значнай пры ўзроўні $P < 0,05$.

Вынікі даследавання і іх абмеркаванне. Наяўнасць дашлюбных сексуальных кантактаў адзначаюць 72,71 % юнакоў і дзяўчат, якія дасягнулі ў сярэднім 20-гадовага ўзросту. Пераважная большасць рэспандэнтаў набыла першы вопыт палавога жыцця да 18 гадоў. Узрост сексуальнага дэбюту вагаецца ад 14 да 22 гадоў і складае ў сярэднім 17,87 ± 1,33 гады (табл. 3). У дзяўчат ён адпавядае афіцыйна ўсталяванаму ў краіне шлюбнаму ўзросту, а юнакі набываюць першы вопыт інтымных адносін у сярэднім на адзін год раней, чым дзяўчаты. Доля прадстаўнікоў мужчынскага полу, якія ўпершыню праявілі сексуальную актыўнасць у малодшым падлеткавым узросце (14—15 гадоў), амаль у 2,5 разы перавышае долю дзяўчат. Звяртае ўвагу працягласць інтэрвалу (6—11 гадоў) паміж узростам першай інтымнай



блізкасці і плануемым узростам рэгістрацыі шлюбу. Паводле вынікаў апытання, студэнцкая моладзь падтрымлівае дваісты стандарт у адносінах да сексуальных паводзін мужчын і жанчын, які даўно сфарміраваўся ў грамадстве. Аб гэтым сведчаць адрозненні ў меркаваннях юнакоў і дзяўчат аб мінімальным дапушчальным узросце першай палавой сувязі. На думку рэспандэнтаў абодвух полаў, для дзяўчат гэты ўзрост павінен быць не ніжэй як 14 гадоў. У той жа час студэнты-юнакі дапускаюць магчымасць першага сексуальнага кантакту для прадстаўнікоў мужчынскага полу ва ўзросце 13,5 гадоў, а рэспандэнты-дзяўчаты паніжаюць гэтую планку нават да 12,5 гадоў. Пераважная большасць (83,03 %) студэнтак адзначае, што будзе вітаць наяўнасць дашлюбнага сексуальнага вопыту ў свайго будучага спадарожніка жыцця. Толькі кожная дзесятая дзяўчына трымаецца процілеглых поглядаў на «новую» сексуальную мараль і аддае перавагу партнёрскім адносінам на фоне афіцыйна зарэгістраванага шлюбу.

**Табліца 3. Некаторыя дэтэрмінанты дашлюбных паводзін і ўстановак рэспандэнтаў ($n$ = 469) у залежнасці ад іх гендарнай прыналежнасці**

| Паказчык | Колькасць рэспандэнтаў рэпандэнтаў | $\overline{X} \pm sx$ | *Xmin* | *Xmax* |
|---|---|---|---|---|
| Узрост на момант апытання | дзяўчаты ($n$ = 383) | 20,24 ± 0,87 | 19,00 | 24,00 |
| | юнакі ($n$ = 86) | 20,09 ± 0,98 | 19,00 | 26,00 |
| Узрост першай інтымнай блізкасці | дзяўчаты ($n$ = 278) | 18,01 ± 1,25 | 14,00 | 22,00 |
| | юнакі ($n$ = 63) | 17,27 ± 1,49* | 14,00 | 21,00 |
| Плануемы ўзрост рэгістрацыі шлюбу | дзяўчаты ($n$ = 363) | 24,01 ± 1,85 | 20,00 | 30,00 |
| | юнакі ($n$ = 75) | 25,82 ± 2,52* | 20,00 | 32,00 |
| Меркаванне аб дапушчальным узросце першай палавой сувязі для дзяўчыны | дзяўчаты ($n$ = 351) | 17,85 ± 1,36 | 14,00 | 25,00 |
| | юнакі ($n$ = 78) | 17,17 ± 1,48 | 14,00 | 21,50 |
| Меркаванне аб дапушчальным узросце першай палавой сувязі для юнака | дзяўчаты ($n$ = 348) | 17,11 ± 1,51 | 12,50 | 23,00 |
| | юнакі ($n$ = 79) | 16,93 ± 1,51 | 13,50 | 21,00 |

Заўвага. * Розніца паміж групамі статыстычна значная ($P < 0,05$).

Абсалютная большасць юнакоў і дзяўчат — будучых бацькоў жадае мець дзяцей. Звяртае ўвагу той факт, што 83,21 ± 1,89 % дзяўчат і 67,52 ± ± 4,33 % юнакоў ($P < 0,001$) плануюць нараджэнне не больш дваіх дзяцей, што адпавядае толькі простаму замяшчэнню пакаленняў і з'яўляецца сур'ёзнай перашкодай на шляху выйсця краіны з дэмаграфічнага крызісу (табл. 4).

**Табліца 4. Асноўныя дэтэрмінанты рэпрадуктыўных установак студэнтаў класічнага ўніверсітэта ў залежнасці ад іх гендарнай прыналежнасці**

| Паказчык | Колькасць рэспандэнтаў ($n$ = 526) | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Дзяўчаты ($n$ = 407) | | Юнакі ($n$ = 119) | |
| | абс. | $p \pm s_p$, % | абс. | $p \pm s_p$, % |
| Жаданне мець дзяцей | 393 | 96,56 ± 0,90 | 117 | 98,32 ± 1,18 |
| Характар узнаўлення: | | | | |
| а) адно дзіця | 78 | 19,85 ± 2,01* | 12 | 10,26 ± 2,81 |
| б) адно дзіця — двое дзяцей | 249 | 63,36 ± 2,43 | 67 | 57,26 ± 4,57 |
| в) трое дзяцей | 45 | 11,45 ± 1,60* | 23 | 19,66 ± 3,67 |
| г) больш траіх дзяцей | 21 | 5,34 ± 1,13* | 15 | 12,82 ± 3,09 |
| Запланаваны тып стварэння сям'і: | | | | |
| а) пазашлюбнае сужыццё | 8 | 1,97 ± 0,69* | 11 | 9,24 ± 2,65 |
| б) афіцыйны шлюб | 223 | 54,79 ± 2,47* | 41 | 34,45 ± 4,36 |
| в) пазашлюбнае сужыццё з наступнай рэгістрацыяй шлюбу | 162 | 39,80 ± 2,43* | 65 | 54,62 ± 4,56 |
| г) вагаюцца ў адказе | 14 | 3,44 ± 0,90 | 2 | 1,68 ± 1,18 |
| Меркаваны зыход першай цяжарнасці пры рэгістрацыі шлюбу: | | | | |
| а) роды | 375 | 92,14 ± 1,33 | 114 | 95,80 ± 1,84 |
| б) штучнае перарыванне (аборт) | 2 | 0,49 ± 0,35 | 0 | 0 + 3,13 |
| в) вагаюцца ў адказе ці зробяць выбар у залежнасці ад абставін | 30 | 7,37 ± 1,30 | 5 | 4,20 ± 1,84 |
| Меркаваны зыход першай цяжарнасці пры сужыцці: | | | | |
| а) роды | 254 | 62,41 ± 2,40* | 56 | 47,06 ± 4,58 |
| б) штучнае перарыванне (аборт) | 86 | 21,13 ± 2,02 | 34 | 28,57 ± 4,14 |
| в) вагаюцца ў адказе ці зробяць выбар у залежнасці ад абставін | 67 | 16,46 ± 1,84 | 29 | 24,36 ± 3,93 |
| Плануемы тэрмін нараджэння жаданага першага дзіцяці: | | | | |
| а) на працягу першага году шлюбу | 112 | 28,50 ± 2,28 | 40 | 34,19 ± 4,39 |
| б) на працягу першых двух гадоў шлюбу | 204 | 51,91 ± 2,52 | 69 | 58,97 ± 4,55 |
| в) праз два гады пасля рэгістрацыі шлюбу | 77 | 19,59 ± 2,00* | 8 | 6,84 ± 2,33 |



| Паказчык | Колькасць рэспандэнтаў ($n$ = 526) | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Дзяўчаты ($n$ = 407) | | Юнакі ($n$ = 119) | |
| | абс. | $p \pm s_p$, % | абс. | $p \pm s_p$, % |
| Інтэргенератыўны інтэрвал: | | | | |
| а) менш 2 гадоў | 17 | 5,40 ± 1,27* | 24 | 22,86 ± 4,10 |
| б) 2—4 гады | 213 | 67,62 ± 2,64 | 65 | 61,90 ± 4,74 |
| в) больш 4 гадоў | 85 | 26,98 ± 2,50* | 16 | 15,24 ± 3,51 |

Заўвагі. * Розніца паміж групамі статыстычна значная ($P$ < 0,05). Паказчык дзетнасці і плануемы тэрмін нараджэння першынца разлічаны ў працэнтах ад колькасці жадаючых мець дзяцей, інтэргенератыўны інтэрвал — ад колькасці жадаючых мець дваіх і болей дзяцей.

Кожная пятая дзяўчына-студэнтка і кожны дзесяты юнак маюць нагул нізкі ўзровень патрэбы ў дзецях у сувязі з прыняццем за норму нараджэнне ў сям'і толькі аднаго дзіцяці. Рэпрадуктыўная устаноўка на маладзетнасць (1—2 дзяцей) дамініруе сярод дзяўчат. Сярод прыхільнікаў нараджэння траіх і болей дзяцей пераважаюць асобы мужчынскага полу (32,48 ± 4,33 % супраць 16,79 ± 1,89 % дзяўчат, $P$ < 0,001). Кожны восьмы будучы бацька жадае выхоўваць больш траіх дзяцей, а 7,69 ± 2,46 % юнакоў плануюць мець сям'ю з пяццю дзяцьмі, што ў 4 разы перавышае долю дзяўчат.Сярод асноўных матывацый нараджэння дзяцей у студэнтаў — будучых бацькоў дамініруюць псіхалагічныя фактары. Амаль палова дзяўчат атаясамлівае нараджэнне дзіцяці з рэалізацыяй патрэбы ў напаўненні ўласнага жыцця сэнсам. Трэць рэспандэнтаў абодвух полаў плануе нараджэнне і выхаванне дзіцяці з мэтай прадоўжыць свой род. Гэты стымул займае прыярытэтнае месца сярод іншых псіхалагічных матывацый нараджэння дзяцей у юнакоў і саступае толькі рэалізацыі патрэбы ў напаўненні жыцця сэнсам сярод дзяўчат. Жаданне ўмацаваць шлюб праз нараджэнне аднаго дзіцяці або некалькіх дзяцей уласціва толькі прадстаўнікам жаночага полу. Абсалютная большасць (93,35 ± 1,09 %) студэнтаў класічнага ўніверсітэта арыентавана на стварэнне традыцыйнай сям'і з афіцыйнай рэгістрацыяй шлюбу. Але частка рэспандэнтаў абодвух полаў, якія плануюць рэгістрацыю шлюбу, не выключае папярэдняе сужыццё. Доля дзяўчат, якія ўпэўнены ў неабходнасці юрыдычнай рэгістрацыі адносін без папярэдняга пазашлюбнага сужыцця, у 1,6 разоў перавышае долю юнакоў (54,79 ± 2,47 % і 34,45 ± 4,36 % адпаведна, $P$ < 0,001). Прыхільнікамі пазашлюбнага сужыцця (з наступнай рэгістрацыяй шлюбу ці без яе) з'яўляюцца пераважна юнакі.

Вывады:

1. Рэпрадуктыўныя паводзіны студэнцкай моладзі характарызуюцца працяглым інтэрвалам (6—11 гадоў) паміж сексуальным дэбютам і плануемым узростам рэгістрацыі шлюбу. Юнакі ўступаюць ў першыя інтымныя кантакты ў сярэднім на адзін год раней, чым дзяўчаты.

2. Абсалютная большасць студэнтаў класічнага ўніверсітэта жадае мець маладзетную сям'ю. Паміж рэпрадуктыўнымі ўстаноўкамі студэнтаў існуе гендарная розніца: сярод дзяўчат дамініруе ўстаноўка на нараджэнне 1—2 дзяцей, сярод прыхільнікаў сем'яў з трыма і болей дзецьмі пераважаюць юнакі.

3. Для студэнтаў універсітэта застаецца маральнай каштоўнасцю традыцыйны сацыяльны інстытут сям'і з афіцыйнай рэгістрацыяй шлюбу. Частка студэнцкай моладзі не выключае папярэдняе сужыццё. Доля студэнтаў-юнакоў, якія аддаюць перавагу пазашлюбнаму сужыццю (з наступнай рэгістрацыяй шлюбу ці без яе), перавышае долю дзяўчат.

**Літаратура:**

1. *Белокриницкая, Т. Е.* Медико-социальный портрет молодой матери, отказавшейся от своего ребенка / Т. Е. Белокриницкая [и др.] // Репродуктивное здоровье детей и подростков. — 2008. — № 2. — С. 9—12.
2. *Протько, Н. Н.* Рискованное половое поведение молодежи: методика выявления подверженности / Н. Н. Протько, Т. В. Калинина, В. Н. Ростовцев // Кіраванне ў адукацыі. — 2006. — № 2. — С. 46—51.



**Бадюкова Т. А.,**
доцент, кандидат исторических наук,
доцент кафедры всеобщей истории
УО «Гродненский государственный
университет имени Янки Купалы»;
**Деречик Д. В.,**
студент 4 курса УО «Гродненский
государственный университет
имени Янки Купалы»

## ПРОБЛЕМЫ СОЗДАНИЯ МОДЕЛИ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТА В СВЕТЕ ГЕНДЕРНЫХ ПОДХОДОВ К ОБРАЗОВАНИЮ

Молодежь как наиболее динамичная социально-демографическая группа включается в общественные отношения с учетом существующих норм и ценностей. Социологический ракурс изучения ценностей и ценностных ориентаций молодежи позволяет наглядно увидеть социальный портрет



этой группы изнутри. Знание о стремлениях, предрасположенностях, ожиданиях, духовно-нравственных ориентирах представителей различных слоев молодых людей позволит обнаружить назревающие проблемы и разработать грамотную государственную молодежную политику.

Нынешнее поколение юношества названо учеными поколением переходного периода. Его становление происходило в период глобальных политических преобразований в странах Центральной и Восточной Европы. Типичной для тоталитарного общества была политика двойных стандартов, в том числе и в сфере ценностных ориентаций. Идеологически одобряемые ценности механически переносились на личностный уровень. Поэтому во многих социологических исследованиях ценностных предпочтений молодежи советского периода очевидно преобладание официально признанных ценностей и норм, приоритет общественного над личным [2].

Социологические исследования, проведенные в Беларуси в 90-е годы XX века, показали, что для молодежи наиболее значимыми являются семья, общение, законность. При этом очевидной является меркантилизация ценностных ориентаций. Согласно результатам исследования, полученным сотрудниками Института социологии Национальной академии наук Республики Беларусь, 61 % опрошенных молодых людей убеждены в том, что сегодня в жизни все решают деньги и связи. 65 % респондентов ориентированы на хороший заработок, 94 % опрошенных ценят инициативу и предприимчивость динамика ценностных ориентаций молодежи в трансформирующемся обществе. Причем гендерный аспект данных исследований не определялся [1, с. 40—42].

Согласно мониторинговым и лонгитюдным исследованиям, которые проводились в Республике Беларусь в течение последних двадцати лет двадцатого века под руководством Е. М. Бабосова при финансовой поддержке Белорусского республиканского фонда фундаментальных исследований, представления о труде как жизненной ценности молодежи за период с 1983 по 1998 год претерпели изменения. Так, например, в 1983 году в трудовой деятельности молодые люди больше всего ценили возможность заниматься любимым делом, на втором месте — применение способностей, на третьем — совершенствование знаний, умений по специальности и общение с людьми и только на седьмом месте — возможность хорошо зарабатывать. Молодое поколение 1998 года иначе структурирует ценности труда. На первом месте — возможность хорошо зарабатывать, на втором — жить спокойно и обеспеченно, на третьем — возможность заниматься любимым делом.

Если говорить о социально-экономическом портрете белорусского студента, то сразу встает вопрос не размера стипендии, не какие-то еще параметры исследования, а будущая востребованность студентов. В конечном